3-17

ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П. М. МАШЭРАВА

УДК 370.153 : 372.219

ЗАЙЦАВА Лілія Генадзьеўна

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ МАЛОДШЫХ ПАДЛЕТКАЎ У ПРАЦЭСЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ШКОЛЫ І СЯМ'І

13.00.01 — агульная педагогіка

Віцебскі ... жаўны ... імя П. ... рава БІБЛІ... ЭКА

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Віцебск – 2000

7Н 2005069 03
3-17

Работа выканана ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце
імя А.А.Куляшова

Навуковы кіраўнік -- кандыдат педагагічных навук, прафесар Сярмяжка Я.І.

Афіцыйныя апаненты: доктар педагагічных навук, прафесар Чэчат В.Ул.
кандыдат педагагічных навук, дацэнт Туркоўскі В.І.

*20504056*

Апаніруючая арганізацыя -- Акадэмія паслядыпломнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Абарона адбудзецца "12" мая 2000 г. у 12 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый К.02.20.01 у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава па адрасу 210036, г.Віцебск, Маскоўскі пр-кт, 33, корпус МГФ, ауд. 407. Тэлефон вучонага сакратара: 25-74-70

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава.

Аўтарэферат разасланы "12" красавіка 2000 г.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый С.І.Сталярова

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання** вызначаецца грамадскай патрэбнасцю ў якасным пераўтварэнні адукацыйна-выхаваўчай сістэмы ў рэспубліцы, асновай якога павінны стаць нацыянальная гісторыя і культура; у стварэнні сістэмы, якая накіравана на выхаванне новых пакаленняў сапраўднымі грамадзянамі сваёй Айчыны, фарміраванне ў іх лепшых рысаў нацыянальнага характару, нацыянальнай самасвядомасці.

Аб актуальнасці работы сведчыць і той факт, што працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці разглядаецца аўтарам ва ўмовах гарадскога асяроддзя, дзе большасць насельніцтва па даных даследавання складаюць беларусы, што прыбылі ў горад з сельскай мясцовасці [с.7].

Актуальнасць праблемы даследавання тлумачыцца тым, што яно непасрэдна звязана з цэласным працэсам фарміравання асобы, у прыватнасці асобы вучня. Носьбітам нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца не толькі нацыя, але і канкрэтная асоба. Узрастанне ролі апошняй у сучасным грамадстве патрабуе больш глыбокага і грунтоўнага вывучэння асаблівасцей як нацыянальных утварэнняў, так і саміх прадстаўнікоў гэтых утварэнняў, спецыфічных асаблівасцей іх быту, псіхалогіі, духоўнай культуры. Веды аб уплыве нацыянальных звычаяў, традыцый, абрадаў на паводзіны, актыўнасць сацыяльнага суб'екта пашыраюць кола пытанняў, якія закранаюць рэальныя ўмовы і тэндэнцыі фарміравання асобы, выяўляюць новыя аспекты ўзрастання яе ролі ў развіцці грамадства.

На стадыі навучання ў сярэдняй школе працэс фарміравання асобы набывае мэтанакіраваны характар, такім жа характарам вызначаецца і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў, якія абапіраюцца ў першую чаргу на працэсы навучання і выхавання. Разам з тым, трэба заўважыць, што сфарміраваць трывалыя пачуцці, веды пра мінулае і сучаснае свайго народа толькі асобнымі ўрокамі ці выхаваўчымі мерапрыемствамі, нават самымі цікавымі, немагчыма. Неабходна сістэма ў рабоце, якая б аб'ядноўвала ў адзінае цэлае вучэбны працэс і пазакласную дзейнасць вучняў. З гэтага пункту гледжання дадзеная работа адлюстроўвае адзін з падыходаў да распрацоўкі сістэмы ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў праз узаемадзеянне школы і сям'і.

Значымасць узнятай праблемы ўзмацняецца наяўнасцю супярэчнасці паміж асвятленнем пытанняў нацыянальнай самасвядомасці ў чыста тэарэтычным аспекце і арганізацыяй практычнай работы па яе фарміраванні.

Пытанням нацыянальнай самасвядомасці прысвечана вялікая колькасць навуковых даследаванняў па філасофіі, этнаграфіі, гісторыі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогіцы. Значны ўклад у даследаванне праблемы ўнеслі філосафы

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Ю.В.Аруцюнян, І.С.Кон, У.М.Конан, К.Н.Хабібулін і інш. У гістарычным аспекце праблему разглядалі Ю.У.Брамлей, В.І.Казлоў, П.І.Кушнер, Л.М.Лыч, Б.Ф.Поршнеў, І.І.Пацехін.

Асаблівую важнасць для вызначанай намі тэмы маюць даследаванні па пытаннях узаемасувязі нацыі і асобы (А.Ф.Дашдаміраў, Р.Я.Мірскі, Б.А.Шувалаў); узаемасувязі нацыі і сям'і (Р.Ачылава, Ю.У.Брамлей, О.В.Мухаметбердыеў); выхавання дзяцей у сям'і, узаемадзеяння школы, сям'і і грамадскасці ў выхаваўчым працэсе, павышэння педагагічнай культуры бацькоў (У.Ф.Валадзько, Л.Ц.Вахоўскі, І.В.Грабеннікаў, В.Р.Сянько, Я.І.Сярмяжка, І.Ф.Харламаў, В.У.Чэчат).

Трэба таксама зазначыць, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці як навуковая праблема генетычна звязана са станаўленнем і развіццём самасвядомасці. Таму для асэнсавання шэрагу яе аспектаў важнае значэнне набываюць распрацоўкі псіхолагаў Б.Г.Ананьева, Л.І.Бажовіч, Л.С.Выгоцкага, А.Н.Лявонцьева, С.Л.Рубінштэйна, І.І.Часнаковай, Б.Д.Эльконіна і інш. Яны разглядаюць самасвядомасць як унутраную аснову асобы, якая ў значнай ступені вызначае ўзровень яе развіцця. У шэрагу прац названых аўтараў яскрава адлюстроўваюцца асноўныя рысы станаўлення самасвядомасці, што ў сваю чаргу дапамагае зразумець узроставую спецыфіку нацыянальнай самасвядомасці.

Распрацоўку праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення нельга весці ў адрыве ад вывучэння вопыту народнага выхавання (Г.Н.Волкаў, А.А.Грымаць, А.Э.Ізмайлаў, Я.І. Сярмяжка, Л.Хрыстова). Зараз, калі асабліва абвастрылася цікавасць да чалавека, да перабудовы яго жыцця, да лёсу краіны, да яе будучага – дзяцей, зварот да народнай спадчыны ўяўляецца справай неабходнай і важнай.

Актуальнасць даследавання вызначаецца і тым, што ў педагагічнай навуцы праблема фарміравання нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў Рэспублікі Беларусь яшчэ не атрымала дастатковага вырашэння, хаця першыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены. Улічваючы недастатковую распрацаванасць пытанняў, звязаных з вышэйназванай праблемай як у адносінах да школы, так і сям'і, і зыходзячы з асноўных мэт і задач, якія стаяць перад нацыянальнай сістэмай адукацыі і выхавання, а таксама актуальнасці праблемы, яе сацыяльна-педагагічнай значнасці, тэмай нашага даследавання мы абралі "Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і".

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Даследаванне адлюстроўвае асноўныя ідэі, палажэнні "Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі", "Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь" і звязана з агульным навуковым напрамкам работы кафедры педагогікі Магі-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

лёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, якая займаецца распрацоўкай тэмы "Змест педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Аўтар таксама прыняла ўдзел у распрацоўцы "Праграмы развіцця сістэмы адукацыі Магілёўскай вобласці на 1998 – 2000 гг."

**Мэта даследавання** – тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка эфектыўнай сістэмы выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і.

Дадзеная мэта даследавання канкрэтызавалася ў наступных **задачах:**
– прааналізаваць стан распрацоўкі праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, прадстаўлены ў навуковых публікацыях;
– раскрыць тэарэтычныя асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
– вызначыць асноўныя напрамкі, змест і формы ўзаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
– вызначыць і эксперыментальна праверыць педагагічныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў; распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па аптымізацыі даследуемага працэсу.

**Аб'ект даследавання** – нацыянальная самасвядомасць малодшых падлеткаў.

**Прадмет даследавання** – працэс узаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў ва ўмовах гарадской агульнаадукацыйнай школы.

**Гіпотэза даследавання** ўтрымлівае наступнае палажэнне: калі арганізацыя ўзаемадзеяння школы і сям'і набывае мэтанакіраваны і кіруемы характар, калі ў педагагічную практыку школы і сям'і ўводзіцца дадатковы інтэгратыўны комплекс ведаў, якія садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў і ўлічваецца вопыт народнага выхавання, то павышаецца эфектыўнасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, таму што пашыраюцца магчымасці прафесійнага ўдасканалення педагогаў, павышэння ўзроўню псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў, далучэння педагогаў, бацькоў і дзяцей да каштоўнасцей нацыянальнай культуры; фарміруецца станоўчая ўстаноўка сям'і на ўзаемадзеянне са школай, у сям'і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці дзяцей.

**Метадалагічную аснову даследавання** складаюць філасофскія палажэнні аб свядомасці і самасвядомасці, нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці; аб узаемадзеянні як механізме, праз які адбываецца змяненне ўзаемадзеючых суб'ектаў; канцэпцыя ўзаемадзеяння выхаваўчых сіл

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Ю.В.Аруцюнян, І.С.Кон, У.М.Конан, К.Н.Хабібулін і інш. У гістарычным аспекце праблему разглядалі Ю.У.Брамлей, В.І.Казлоў, П.І.Кушнер, Л.М.Лыч, Б.Ф.Поршнеў, І.І.Пацехін.

Асаблівую важнасць для вызначанай намі тэмы маюць даследаванні па пытаннях узаемасувязі нацыі і асобы (А.Ф.Дашдаміраў, Р.Я.Мірскі, Б.А.Шувалаў); узаемасувязі нацыі і сям'і (Р.Ачылава, Ю.У.Брамлей, О.В.Мухаметбердыеў); выхавання дзяцей у сям'і, узаемадзеяння школы, сям'і і грамадскасці ў выхаваўчым працэсе, павышэння педагагічнай культуры бацькоў (У.Ф.Валадзько, Л.І.Ц.Вахоўскі, І.В.Грабеннікаў, В.Р.Сянько, Я.І.Сярмяжка, І.Ф.Харламаў, В.У.Чэчат).

Трэба таксама зазначыць, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці як навуковая праблема генетычна звязана са станаўленнем і развіццём самасвядомасці. Таму для асэнсавання шэрагу яе аспектаў важнае значэнне набываюць распрацоўкі псіхолагаў Б.Г.Ананьева, Л.І.Бажовіч, Л.С.Выгоцкага, А.Н.Лявонцьева, С.Л.Рубінштэйна, І.І.Часнаковай, Б.Д.Эльконіна і інш. Яны разглядаюць самасвядомасць як унутраную аснову асобы, якая ў значнай ступені вызначае ўзровень яе развіцця. У шэрагу прац названых аўтараў яскрава адлюстроўваюцца асноўныя рысы станаўлення самасвядомасці, што ў сваю чаргу дапамагае зразумець узроставую спецыфіку нацыянальнай самасвядомасці.

Распрацоўку праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення нельга весці ў адрыве ад вывучэння вопыту народнага выхавання (Г.Н.Волкаў, А.А.Грымаць, А.Э.Ізмайлаў, Я.І. Сярмяжка, Л.Хрыстова). Зараз, калі асабліва абвастрылася цікавасць да чалавека, да перабудовы яго жыцця, да лёсу краіны, да яе будучага – дзяцей, зварот да народнай спадчыны ўяўляецца справай неабходнай і важнай.

Актуальнасць даследавання вызначаецца і тым, што ў педагагічнай навуцы праблема фарміравання нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў Рэспублікі Беларусь яшчэ не атрымала дастатковага вырашэння, хаця першыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены. Улічваючы недастатковую распрацаванасць пытанняў, звязаных з вышэйназванай праблемай як у адносінах да школы, так і сям'і, і зыходзячы з асноўных мэт і задач, якія стаяць перад нацыянальнай сістэмай адукацыі і выхавання, а таксама актуальнасці праблемы, яе сацыяльна-педагагічнай значнасці, тэмай нашага даследавання мы абралі "Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і".

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Даследаванне адлюстроўвае асноўныя ідэі, палажэнні "Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі", "Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь" і звязана з агульным навуковым напрамкам работы кафедры педагогікі Магі-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

лёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, якая займаецца распрацоўкай тэмы "Змест педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Аўтар таксама прыняла ўдзел у распрацоўцы "Праграмы развіцця сістэмы адукацыі Магілёўскай вобласці на 1998 – 2000 гг."

**Мэта даследавання** – тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка эфектыўнай сістэмы выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і.

Дадзеная мэта даследавання канкрэтызавалася ў наступных **задачах:**
– прааналізаваць стан распрацоўкі праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, прадстаўлены ў навуковых публікацыях;
– раскрыць тэарэтычныя асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
– вызначыць асноўныя напрамкі, змест і формы ўзаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
– вызначыць і эксперыментальна праверыць педагагічныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў; распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па аптымізацыі даследуемага працэсу.

**Аб'ект даследавання** – нацыянальная самасвядомасць малодшых падлеткаў.

**Прадмет даследавання** – працэс узаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў ва ўмовах гарадской агульнаадукацыйнай школы.

**Гіпотэза даследавання** ўтрымлівае наступнае палажэнне: калі арганізацыя ўзаемадзеяння школы і сям'і набывае мэтанакіраваны і кіруемы характар, калі ў педагагічную практыку школы і сям'і ўводзіцца дадатковы інтэгратыўны комплекс ведаў, якія садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў і ўлічваецца вопыт народнага выхавання, то павышаецца эфектыўнасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, таму што пашыраюцца магчымасці прафесійнага ўдасканалення педагогаў, павышэння ўзроўню псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў, далучэння педагогаў, бацькоў і дзяцей да каштоўнасцей нацыянальнай культуры; фарміруецца станоўчая ўстаноўка сям'і на ўзаемадзеянне са школай, у сям'і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці дзяцей.

**Метадалагічную аснову даследавання** складаюць філасофскія палажэнні аб свядомасці і самасвядомасці, нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці; аб узаемадзеянні як механізме, праз які адбываецца змяненне ўзаемадз... выхаваўчых сіл

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

у фарміраванні асобы. У даследаванні выкарыстоўваліся вывады псіхолага-педагагічнай навукі аб узроставых асаблівасцях развіцця падлеткаў. У якасці метадалагічных пасылак былі выкарыстаны палажэнні аб ролі грамадскіх зносін, сацыяльнага асяроддзя, культуры і іншых фактараў у фарміраванні асобы, яе свядомасці, каштоўнасных арыентацый. Пры распрацоўцы тэмы даследавання выкарыстоўваліся дзяржаўныя дакументы па пытаннях адукацыі і выхавання ў Рэспубліцы Беларусь.

У працэсе даследавання былі выкарыстаны наступныя **метады:**

– тэарэтычныя метады: аналіз філасофскай, гістарычнай, псіхолага-педагагічнай, сацыялагічнай літаратуры па праблеме даследавання; мадэліраванне выхаваўчага працэсу; абагульненне, аналіз комплексна-мэтавых праграм школ, планаў выхаваўчай работы школ і пазашкольных устаноў;
– эмпірычныя метады: уключанае назіранне; анкетаванне падлеткаў, настаўнікаў, бацькоў; гутаркі з кіраўнікамі, настаўнікамі, выхавальнікамі школ і пазашкольных устаноў, кіраўнікамі органаў адукацыі, навучэнцамі і іх бацькамі; вывучэнне перадавога педагагічнага вопыту; выкарыстанне педагагічных сітуацый;
– педагагічны эксперымент;
– матэматычныя метады апрацоўкі вынікаў.

**База даследавання** – сярэднія школы №№ 20, 30 г. Магілёва, №№1, 4 г.Асіповічы, цэнтр выхаваўчай работы г.Асіповічы.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць** даследавання заключаюцца ў комплексным разглядзе праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ва ўзаемасувязі філасофскага, сацыялагічнага, псіхалагічнага і педагагічнага аспектаў; абгрунтаванні змястоўнага аспекту фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і спецыфікі яе праяўлення ў дзяцей малодшага падлеткавага ўзросту; характарыстыцы ўзроўняў яе сфарміраванасці; распрацоўцы мадэлі сістэмы выхаваўчай работы, якая забяспечвае мэтанакіраванасць дзейнасці, адзінства выхаваўчага ўздзеяння школы і сям'і на асобу школьніка з улікам яе ўзроставых асаблівасцей, пашырэнне магчымасцей школьнікаў у іх самарэалізацыі; абгрунтаванні педагагічных умоў эфектыўнасці працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў праз узаемадзеянне школы і сям'і.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць** атрыманых вынікаў заключаецца ў апрабацыі методыкі ўзаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў; напрацоўцы эмпірычнага матэрыялу; распрацоўцы навукова-практычных рэкамендацый па ўдасканаленні працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў. Змешчаныя ў дысертацыі вывады і практычныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны і выкарыстаны настаўнікамі ў рабоце з класнымі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

кіраўнікамі, выхавальнікамі пазашкольных устаноў; у распрацоўцы і выкладанні курса педагогікі, методыкі выхаваўчай работы; у матэрыялах лекцый, спецкурсаў, спецсемінараў у сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў; у працэсе далейшага даследавання праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Сацыяльная значнасць вынікаў вызначаецца тым, што абгрунтаваны аўтарам падыход да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў і атрыманыя вынікі адкрываюць магчымасці ўдасканалення працэсу патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, вырашэння на новым узроўні актуальных пытанняў узаемадзеяння школы і сям'і, што станоўча ўплывае па якаснае змяненне асабістых якасцей школьнікаў.

**Верагоднасць вынікаў даследавання** забяспечваецца метадалагічнай абгрунтаванасцю зыходных пазіцый аўтара; выкарыстаннем комплекснай методыкі, адэкватнай задачам і прадмету даследавання; магчымасцю эксперыментальнай праверкі гіпотэзы; спалучэннем колькаснага і якаснага аналізу вынікаў.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Нацыянальная самасвядомасць малодшых падлеткаў як складанае структурнае, дынамічнае ўтварэнне характарызуецца ўсведамленнем прыналежнасці да пэўнай нацыянальнай супольнасці, ступенню авалодання ведамі пра родную краіну, яе культурна-гістарычную спадчыну; характарам праяўлення эмоцый, пачуццяў, перажыванняў; імкненнем і гатоўнасцю да актыўнай рэалізацыі творчых здольнасцей асобы, яе духоўных сіл у розных сферах дзейнасці на карысць Радзіме.

2. Умовы эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўключаюць:

1) умовы эфектыўнасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці як састаўляючай цэласнага выхаваўчага працэсу;
2) умовы эфектыўнага ўзаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў.

3. Эфектыўнасць выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, у значнай ступені вызначаецца ўзроўнем узаемадзеяння школы і сям'і і магчымасцямі аптымізацыі гэтага ўзаемадзеяння сродкамі распрацаванай мадэлі сістэмы выхаваўчай работы.

**Асабісты ўклад саіскальніка** заключаецца ў распрацоўцы праграмы і методыкі даследавання; правядзенні вопытна-эксперыментальнай работы ў сярэдніх школах г.Магілёва і Магілёўскай вобласці; стварэнні і ўкараненні ў практыку сістэмы работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў праз узаемадзеянне школы і сям'і;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

стварэнні вучэбна-метадычных матэрыялаў і дапаможнікаў для студэнтаў, настаўнікаў, выкладчыкаў.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры педагогікі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. Асноўныя навуковыя вывады і практычныя рэкамендацыі дакладваліся: на канферэнцыі "Шляхі і сродкі ўдасканалення падрыхтоўкі педагагічных кадраў" (г.Магілёў, 1993); рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях "Воспитание молодежи в духе гражданственности, патриотизма и готовности к службе в армии Республики Беларусь" (г.Минск, 1995); "Содержание педагогического образования в Республике Беларусь" (г.Могилев, 1995); міжнародных навукова-практычных канферэнцыях "Теория и практика воспитательной работы в высших учебных заведениях" (г.Горки, 1997), "Наследие А.С.Макаренко и проблемы реформирования современной системы образования" (г.Минск, 1998).

**Апублікаванасць вынікаў.** Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 11 публікацыях аўтара, у тым ліку ў матэрыялах навуковых канферэнцый – 5; у часопісе "Народная асвета" – 1; у зборніках навуковых даследаванняў – 3; у навуковых метадычных дапаможніках – 2 (у тым ліку 1 у сааўтарстве). Агульны аб'ём публікацый – 102 старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц. Аб'ём дысертацыі складае 118 старонак, у тым ліку 13 старонак займае спіс выкарыстаных крыніц. У ёй змяшчаецца 15 табліц і 3 малюнкі. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 230 найменняў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першай главе** "Тэарэтычныя асновы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў" вызначаюцца асноўныя этапы развіцця праблемы нацыянальнай самасвядомасці ў айчыннай навуцы, удакладняецца паняційны апарат даследавання, разглядаюцца асаблівасці станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, раскрываецца структура дадзенага ўтварэння ў малодшых падлеткаў і абгрунтоўваецца неабходнасць узаемадзеяння сацыяльных інстытутаў у яе фарміраванні.

Распрацоўка праблемы нацыянальнай самасвядомасці прадстаўляе сабой працяглы і нераўнамерны ў сваім развіцці працэс. На першым этапе важны ўклад у яе даследаванне ўнеслі працы П.І.Кушнера, Д.С.Ліхачова, У.У.Маўродзіна, дзе разглядаліся вытокі, кампаненты, формы праяўлення

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

нацыянальнай самасвядомасці. У далейшым важныя тэарэтыка-метадалагічныя пытанні структуры, зместу, фарміравання нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці, нацыянальнай мовы і нацыянальнай самасвядомасці знайшлі сваё адлюстраванне ў работах Ю.У.Брамлея, А.Ф.Дашдамірава, Л.М.Дробіжавай, В.І.Казлова, М.І.Кулічэнкі, С.А.Токарава, М.М.Чабаксарава і інш.

Шэраг пытанняў, звязаных з праблемай нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, разглядаюцца ў работах Л.М.Лыча, А.І.Мальдзіса, Т.М.Мікуліч, В.А.Салеева, І.У.Чаквіна, Н.С.Шпак і інш.

З'явіўшыеся ў пачатку 90-х гадоў даследаванні Л.А.Альшэўскай, Л.М.Варанецкай, Н.К.Катовіч, Г.Т.Танірбергенавай, А.М.Цяцерыч, Л.П.Чагай дазваляюць больш абгрунтавана падыйсці да разгляду нацыянальнай самасвядомасці асобы, асаблівасцей яе фарміравання ў асобных сацыяльных катэгорый грамадства. Аднак, найменш вывучанымі застаюцца пытанні фарміравання нацыянальнай самасвядомасці такой катэгорыі, як вучні. У адпаведнасці з гэтым мы сканцэнтравалі сваю ўвагу на даследаванні дадзенага працэсу ў школьнікаў падлеткавага ўзросту, лічачы яго найбольш спрыяльным для засваення духоўнай спадчыны народа. Адначасова адзначаем, што ў літаратуры не знайшлі дастатковага асвятлення і пытанні ўплыву сацыяльных інстытутаў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы (у тым ліку асобы вучня). Гэта акалічнасць абумовіла выбар прадмета даследавання.

Абапіраючыся на папярэднія вынікі вывучэння праблемы, мы разглядаем нацыянальную самасвядомасць асобы як усведамленне чалавекам самога сябе прадстаўніком пэўнай нацыі, усведамленне сваіх дзеянняў, творчых магчымасцей, пачуццяў, матываў паводзін у сферы нацыянальных зносін, якія фарміруюцца па меры развіцця асобы, духоўна-практычнага засваення рэчаіснасці, рэалізацыі асабістага нацыянальнага "Я". Пры гэтым адзначаем, што ў ёй адлюстроўваюцца не толькі характэрныя рысы сваёй нацыі, але і адносіны з іншымі нацыямі і народамі (міжнацыянальная накіраванасць нацыянальнай самасвядомасці).

Выніковасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці залежыць ад дакладнага ўяўлення яе структуры. Аналізуючы розныя падыходы да складаючых дадзенага ўтварэння, мы прытрымліваемся пункту гледжання, згодна якому ў структуры нацыянальнай самасвядомасці асобы вылучаем наступныя кампаненты:

– кагнітыўны (пазнаваўчы) кампанент, які ўключае ўсведамленне індывідумам сябе як прадстаўніка нацыі пры дапамозе ўяўленняў, ведаў і т.п. У прыватнасці, сюды адносіцца ўсведамленне нацыянальнай прыналежнасці; усведамленне агульнасці паходжання членаў этнасу; веданне гісторыі і культуры свайго народа; веданне роднай мовы і г.д.;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

3. Уплыў шэрагу знешніх (макраасяроддзе, мікраасяроддзе, этнаасяроддзе) і ўнутраных (асобасных) фактараў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ўскладняе даследуемы працэс. Акцэнтаваўшы ўвагу на ўплыве мікраасяроддзя мы адзначаем, што ў малодшым падлеткавым узросце вядучая роля ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці належыць школе і сям'і. Іх узаемадзеянне – неабходная ўмова аптымізацыі дадзенага працэсу менавіта таму, што гэтыя сацыяльныя інстытуты ў сілу свайго спецыфічнага ўздзеяння на асобу садзейнічаюць паспяховаму ўваходжанню яе ў нацыянальнае асяроддзе, у свет агульначалавечых каштоўнасцей. Умовамі паспяховасці працэсу ўзаемадзеяння з'яўляюцца:

- мэтанакіраванасць узаемадзеяння і сістэмны падыход да арганізацыі работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
- падрыхтаванасць настаўнікаў і бацькоў да работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці;
- выкарыстанне ў дзейнасці кожнага з суб'ектаў выхаваўчага працэсу (школы і сям'і) спецыфічных магчымасцей другога суб'екту [2; 3; 7; 10].

4. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў не можа ажыццяўляцца толькі шляхам рэалізацыі тэарэтычных мадэляў. Бацькі і настаўнікі, якія ўдзельнічаюць у выхаваўчым працэсе, накіраваным на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, з неабходнасцю павінны абапірацца на гістарычна складзены вопыт.

Лепшыя рысы выхаваўчай мудрасці народа ўвабрала ў сябе народная педагогіка, якая разглядаецца намі як эфектыўны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў малодшых падлеткаў. Яна мае разнастайны арсенал сродкаў навучання і выхавання – родная мова, фальклор, народныя гульні, песні, танцы, традыцыі і абрады і інш. Іх выкарыстанне ў вучэбна-выхаваўчым працэсе дазваляе больш ярка і змястоўна перадаць веды аб родным краі і яго людзях. Асаблівую цікавасць (што пацвердзіла доследна-эксперыментальная работа) выклікаюць у малодшых падлеткаў такія жанры вуснай народнай творчасці як прыказкі і прымаўкі, загадкі, легенды і паданні, казкі. Выкарыстанне народных гульняў і песень надавала асаблівы каларыт народным святам ("Масленіца", "Калядкі", "Гуканне вясны").

Асаблівай увагі заслугоўвае азнаямленне бацькоў з народнай педагогікай і яе выкарыстанне ў сямейным выхаванні. Менавіта таму, што ў педагагічнай спадчыне народа знайшла адлюстраванне гістарычна складзеная сістэма, якая спрыяе гуманнаму выхаванню асобы [1; 4; 6; 10; 11].

5. Пазакласная выхаваўчая работа, накіраваная на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, мае вялікія магчымасці ў выбары зместу і форм работы з улікам узросту і цікавасці дзяцей. Адначасова,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

яна з'яўляецца лагічным выражэннем адзінства навучання і выхавання ў вырашэнні ўзнятай праблемы.

Складанасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці патрабуе рэалізацыі сістэмнага падыходу да арганізацыі выхаваўчай работы. У даследаванні вылучаны наступныя этапы стварэння сістэмы:

1-ы – вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, падрыхтаванасці настаўнікаў і бацькоў да сумеснай работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;

2-і – фармулёўка мэт і задач, вызначэнне асноўных накірункаў выхаваўчай работы;

3-і – вызначэнне зместу выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і форм яго рэалізацыі;

4-ы – вызначэнне структуры фарміруемай сістэмы [10; 11].

6. Дадзенае даследаванне не вычэрпвае ўсіх аспектаў праблемы. Далейшай распрацоўкі патрабуюць такія пытанні, як уплыў сям'і на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці; роля краязнаўства ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці; музычная творчасць як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Застаюцца нераспрацаванымі дыдактычныя аспекты ўзнятай праблемы.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ


1. Зайцава Л.Г. Нацыянальная самасвядомасць і нацыянальная культура // Актуальные проблемы обучения и воспитания (материалы исследования молодых ученых). — Могилев, 1993. — С. 51-53.
2. Глушакова Г.П., Зайцава Л.Г. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў // Шляхі і сродкі ўдасканалення падрыхтоўкі педагагічных кадраў (матэрыялы юбілейнай канферэнцыі). — Магілёў, 1993. — С. 28-30.
3. Зайцава Л.Г. Гульня ў прафесійнай падрыхтоўцы будучага настаўніка // Содержание педагогического образования в Республике Беларусь: Материалы республиканской конференции 5-7 декабря 1995 г. — Могилев, 1995. — С. 65-67.
4. Зайцава Л.Г. Народная педагогіка як сродак патрыятычнага выхавання школьнікаў // Воспитание молодежи в духе гражданственности, патриотизма и готовности к службе в армии Республики Беларусь. Материалы республиканской научно-практической конференции, посвященной 50-летию победы в Великой Отечественной войне. — Минск, 1995. — С.57-59.


ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

3. Уплыў шэрагу знешніх (макраасяроддзе, мікраасяроддзе, этнаасяроддзе) і ўнутраных (асобасных) фактараў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ўскладняе даследуемы працэс. Акцэнтаваўшы ўвагу на ўплыве мікраасяроддзя мы адзначаем, што ў малодшым падлеткавым узросце вядучая роля ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці належыць школе і сям'і. Іх узаемадзеянне – неабходная ўмова аптымізацыі дадзенага працэсу менавіта таму, што гэтыя сацыяльныя інстытуты ў сілу свайго спецыфічнага ўздзеяння на асобу садзейнічаюць паспяховаму ўваходжанню яе ў нацыянальнае асяроддзе, у свет агульначалавечых каштоўнасцей. Умовамі паспяховасці працэсу ўзаемадзеяння з'яўляюцца:

- мэтанакіраванасць узаемадзеяння і сістэмны падыход да арганізацыі работы на фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;
- падрыхтаванасць настаўнікаў і бацькоў да работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці;
- выкарыстанне ў дзейнасці кожнага з суб'ектаў выхаваўчага працэсу (школы і сям'і) спецыфічных магчымасцей другога суб'екту [2; 3; 7; 10].

4. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў не можа ажыццяўляцца толькі шляхам рэалізацыі тэарэтычных мадэляў. Бацькі і настаўнікі, якія ўдзельнічаюць у выхаваўчым працэсе, накіраваным на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, з неабходнасцю павінны абапірацца на гістарычна складзены вопыт.

Лепшыя рысы выхаваўчай мудрасці народа ўвабрала ў сябе народная педагогіка, якая разглядаецца намі як эфектыўны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў малодшых падлеткаў. Яна мае разнастайны арсенал сродкаў навучання і выхавання – родная мова, фальклор, народныя гульні, песні, танцы, традыцыі і абрады і інш. Іх выкарыстанне ў вучэбна-выхаваўчым працэсе дазваляе больш ярка і змястоўна перадаць веды аб родным краі і яго людзях. Асаблівую цікавасць (што пацвердзіла доследна-эксперыментальная работа) выклікаюць у малодшых падлеткаў такія жанры вуснай народнай творчасці як прыказкі і прымаўкі, загадкі, легенды і паданні, казкі. Выкарыстанне народных гульняў і песень надавала асаблівы каларыт народным святам ("Масленіца", "Калядкі", "Гуканне вясны").

Асаблівай увагі заслугоўвае азнаямленне бацькоў з народнай педагогікай і яе выкарыстанне ў сямейным выхаванні. Менавіта таму, што ў педагагічнай спадчыне народа знайшла адлюстраванне гістарычна складзеная сістэма, якая спрыяе гуманнаму выхаванню асобы [1; 4; 6; 10; 11].

5. Пазакласная выхаваўчая работа, накіраваная на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, мае шырокія магчымасці ў выбары зместу і форм работы з улікам узросту і цікавасці дзяцей. Адначасова,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

яна з'яўляецца лагічным выражэннем адзінства навучання і выхавання ў вырашэнні ўзнятай праблемы.

Складанасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці патрабуе рэалізацыі сістэмнага падыходу да арганізацыі выхаваўчай работы. У даследаванні вылучаны наступныя этапы стварэння сістэмы:

1-ы – вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў, падрыхтаванасці настаўнікаў і бацькоў да сумеснай работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў;

2-і – фармулёўка мэт і задач, вызначэнне асноўных накірункаў выхаваўчай работы;

3-і – вызначэнне зместу выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і форм яго рэалізацыі;

4-ы – вызначэнне структуры фарміруемай сістэмы [10; 11].

6. Дадзенае даследаванне не вычэрпвае ўсіх аспектаў праблемы. Далейшай распрацоўкі патрабуюць такія пытанні, як уплыў сям'і на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці; роля краязнаўства ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці; музычная творчасць як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Застаюцца нераспрацаванымі дыдактычныя аспекты ўзнятай праблемы.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ


1. Зайцава Л.Г. Нацыянальная самасвядомасць і нацыянальная культура // Актуальные проблемы обучения и воспитания (материалы исследования молодых ученых). — Могилев, 1993. — С. 51-53.
2. Глушакова Г.П., Зайцава Л.Г. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў // Шляхі і сродкі ўдасканалення падрыхтоўкі педагагічных кадраў (матэрыялы юбілейнай канферэнцыі). — Магілёў, 1993. — С. 28-30.
3. Зайцава Л.Г. Гульня ў прафесійнай падрыхтоўцы будучага настаўніка // Содержание педагогического образования в Республике Беларусь: Материалы республиканской конференции 5-7 декабря 1995 г. — Могилев, 1995. — С. 65-67.
4. Зайцава Л.Г. Народная педагогіка як сродак патрыятычнага выхавання школьнікаў // Воспитание молодежи в духе гражданственности, патриотизма и готовности к службе в армии Республики Беларусь. Материалы республиканской научно-практической конференции, посвященной 50-летию победы в Великой Отечественной войне. — Минск, 1995. — С.57-59.


ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

5. Зайцева Л.Г. Роль семьи в формировании национального самосознания детей // Материалы исследований молодых ученых и аспирантов. — Могилев, 1995. — С. 21-24.
6. Зайцава Л.Г. Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай самасвядомасці // Нарысы педагагічнай думкі беларускага народа (Пад рэд. Я.І.Сярмяжкі). — Магілёў, 1995. — С. 30-46.
7. Зайцава Л.Г. Нацыянальныя аспекты выхавання студэнтаў // Теория и практика воспитательной работы в высших учебных заведениях: Материалы международной научно-практической конференции. — Горки, 1997. — С. 152-153.
8. Зайцева Л.Г. Теоретические аспекты взаимодействия школы и семьи в воспитательном процессе // Материалы исследований молодых ученых, аспирантов, соискателей и студентов. — Могилев, 1997. — С. 35-39.
9. Зайцева Л.Г. А.С.Макаренко и современные проблемы семейного воспитания // Наследие А.С.Макаренко и проблемы реформирования современной системы образования: Материалы международной научно-практической конференции (26-27 апреля 1998 г.). — Минск, 1998. — С. 75-76.
10. Зайцава Л.Г. Узаемадзеянне школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў. Магілёў: МДУ, 1998. — 60 с.
11. Зайцава Л.Г. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў // Народная асвета, 1998. – № 7. – С. 66-73.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# РЭЗЮМЕ

Зайцава Лілія Генадзьеўна

## Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і

**Ключавыя словы:** самасвядомасць, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальныя каштоўнасці народа, узаемадзеянне школы і сям'і, педагагічная культура бацькоў, каштоўнасныя арыентацыі падлеткаў, вусная народная творчасць, беларуская народная педагогіка, нацыянальная культура, педагагічныя ўмовы.

**Аб'ект даследавання** — нацыянальная самасвядомасць малодшых падлеткаў.

**Прадмет даследавання** — працэс узаемадзеяння школы і сям'і ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў ва ўмовах гарадской агульнаадукацыйнай школы.

**Мэта даследавання** — распрацоўка і тэарэтычнае абгрунтаванне эфектыўнай сістэмы выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў у працэсе ўзаемадзеяння школы і сям'і.

У ходзе даследавання выкарыстоўвалася комплексная методыка, якая ўключала вывучэнне і аналіз філасофскай, гістарычнай, псіхалагічнай, сацыялагічнай, педагагічнай літаратуры па праблеме даследавання; анкетаванне, гутаркі з вучнямі, кіраўнікамі і настаўнікамі школ, кіраўнікамі і выхавацелямі пазашкольных устаноў, кіраўнікамі органаў адукацыі, бацькамі; уключанае назіранне; вывучэнне масавага і перадавога вопыту; мадэліраванне выхаваўчага працэсу; псіхолага-педагагічны эксперымент; матэматычная апрацоўка атрыманых дадзеных.

У даследаванні абгрунтаваны змястоўны аспект нацыянальнай самасвядомасці асобы школьніка і спецыфіка яго праяўлення ў малодшых падлеткаў, распрацаваны крытэрыі і паказчыкі, вызначаны ўзроўні сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў. У рабоце раскрыта методыка ўзаемадзеяння школы і сям'і ў працэсе фарміравання нацыянальнай самасвядомасці малодшых падлеткаў; вызначаны педагагічныя ўмовы эфектыўнасці дадзенага працэсу.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны і выкарыстоўваюцца ў рабоце з настаўнікамі, выхавацелямі пазашкольных устаноў; пры распрацоўцы і выкладанні курса педагогікі, методыкі выхаваўчай работы, у сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў; у працэсе далейшага даследавання праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# РЕЗЮМЕ

Зайцева Лилия Генадьевна

## Формирование национального самосознания младших подростков в процессе взаимодействия школы и семьи

**Ключевые слова:** самосознание, национальное самосознание, национальные ценности народа, взаимодействие школы и семьи, педагогическая культура родителей, ценностные ориентации подростков, устное народное творчество, белорусская народная педагогика, национальная культура, педагогические условия.

**Объект исследования** — национальное самосознание младших подростков.

**Предмет исследования** — процесс взаимодействия школы и семьи в формировании национального самосознания младших подростков в условиях городской общеобразовательной школы.

**Цель исследования** — разработка и теоретическое обоснование эффективной системы воспитательной работы, направленной на формирование национального самосознания младших подростков в процессе взаимодействия школы и семьи.

В ходе исследования использовалась комплексная методика, включающая изучение и анализ философской, исторической, психологической, социологической, педагогической литературы по проблеме исследования; анкетирование, беседы с учащимися, руководителями и учителями школ, руководителями и воспитателями внешкольных учреждений, руководителями органов образования, родителями; включенное наблюдение; изучение массового и передового педагогического опыта; моделирование воспитательного процесса; психолого-педагогический эксперимент; математическая обработка полученных данных.

В исследовании обоснован содержательный аспект национального самосознания личности школьника и специфика его проявления у младших подростков, разработаны критерии и показатели, определены уровни сформированости национального самосознания младших подростков. В работе раскрыта методика взаимодействия школы и семьи в процессе формирования национального самосознания младших подростков; определены педагогические условия эффективности данного процесса.

Результаты исследования могут быть использованы в работе с учителями, воспитателями внешкольных учреждений; при разработке и преподавании курса педагогики, методики воспитательной работы, в системе повышения квалификации учителей; в процессе дальнейшего исследования проблемы формирования национального самосознания.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

**Zaitseva Lilia Genadievna**

**Formation of National Self-consciousness of Junior Teenagers**

**Key words:** self-consciousness, national self-consciousness, national values of people, interaction of school and family, pedagogical culture of parents, moral values of teenagers, verbal folklore, Belarusian national pedagogics, national culture, pedagogical culture.

**The object of the thesis** is the national self-consciousness of children 10-12, iternational of school and family in the formation of national self-consciousness of junior teenagers in the conditions of the citi secondary school.

**The aim of the research** is to seach and work out effective educational systems in the formation of national self-consciousness of junior teenagers by means of intreaction of school and family.

In the process of research complex methodology has been used which consists of study and analysis of philosophical, psychological, pedagogical and sociological literature, study of mass and innovative experience, questionnaires, talks with children, teachers and leaders of secondary schools and pre-school establishments, leaders of national educational bodies modeling of the up-bringing process, the psychologic-pedagogical experiment, mathematical working out of the defined data.

In the process of the research the main aspect of the national self-consciousness of the pupil's personality and the specification of its manifestation of junior feenagers has been grounded; the criterion and the data are worked out; the levels of the formation of national self-consciousness are determined; on their basis.

The methods of interaction of school and family in the process of the formation of national self-consciousness of junior teenagers have been revealed; the pedagogical conditions of the effectioeness of the given process are determined.

All the data, worked out and experimentally approved alongside with the results of the research can be used and are being used in the school and pre-school pedagogics course, in the working out and teaching of pedagogics course, methodology of teaching and children's upbringing, in in-servise training of the nursery and secondary school teachers in the process of further development and formation of of national self-consciousness of junior teenagers.


ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ